Цітоў І.

# СНАЙПЕРСКІ РАХУНАК

**Сярод Герояў Савецкага Саюза – ураджэнцаў нашага раёна – адно з пачэсных месц займае Генадзь Іосіфавіч Вялічка. Матэрыял аб бясстрашным снайперу мы змяшчаем сёння, перадрукаваўшы яго з газеты "Звязда" ад 9 верасня гэтага года.**

Пра баявую славу земляка-беларуса я даведаўся з франтавой газеты "Советский воин" яшчэ ў пачатку 1943 года, У ёй быў надрукаваны верш паэта Марка Лісянскага:

Эхо трижды хлопает –
то Величко бьёт,
Белорусский хлопец –
двадцать первый год,
У Величко выстрел
выверен всегда:
Одному фашисту –
пуля лишь одна.
Двадцати фашистам
Двадцать пуль пошлет.
Будет ровно триста –
будет круглый счет...

Прарочыя словы паэта збыліся. Праслаўлены снайпер радавы Генадзь Вялічка і сапраўды за час вайны знішчыў больш за трыста фашыстаў...

А сустрэліся мы з ім толькі праз 34 гады ў шахцёрскім горадзе Янакіева, дзе цяпер жыве і працуе афіцэр запасу Герой Савецкага Саюза Генадзь Іосіфавіч Вялічка.

– Вы, Генадзь, Іосіфавіч, з Аршанскага раёна, – сказаў я. – А як апынуліся ў Данбасе?

– Так, сапраўды, нарадзіўся ў вёсцы Лутня, што пад Оршай. Усе родныя загінулі ў час вайны. А тут, у Данбасе, давялося ваяваць. Пры вызваленні горада Каменск-Шахценскі быў тройчы паранены... Вось і прыкіпеў сэрцам да гэтых мясцін. Пасля перамогі паехаў ды і застаўся працаваць.

Гаворка задоўжылася. Былы праслаўлены снайпер шмат расказаў пра свае франтавыя шляхі-дарогі.

...Стаяў спякотны жнівень 1941-га. Полк, з якім адступаў радавы Генадзь Вялічка, адыходзіў к Дону. На душы было горка. Хацелася піць. Твар і спіна пакрыліся потам, на зубах скрыпеў пясок... Потым прагучаў загад: заняць ля берага ракі абарону і капаць акопы. Да прыцемкаў

працавалі салдаты, падрыхтавалі надзейны рубеж, выставілі баявую варту.

Ротны прызначыў радавога Вялічку старшым у кулямётны разлік і загадаў з двума салдатамі высунуцца на правы фланг палка і трымаць абарону вельмі важнага ў стратэгічных адносінах участка. Ноч прайшла параўнаўча спакойна. Затое на світанку з-за невялічкага пералеска паказаліся фашысцкія танкі, а прама на агнявую кропку рухаліся ланцугі аўтаматчыкаў.

Кулямётчыкі цярпліва чакалі набліжэння гітлераўцаў. Калі да іх засталося якіх дзвесце метраў, агонь адкрыў Іван Дзегцяроў. Фашысты заляглі. Яны спрабавалі двойчы падняцца і, панёсшы значныя страты, зноў прыціскаліся да зямлі.

Потым за кулямёт залёг Генадзь Вялічка. Колькі разоў паднімаліся варожыя салдаты, кідаючыся ў атакі, але кожны раз адкатваліся назад, пакідаючы на полі бою шмат трупаў.

Пра стойкасць кулямётчыкаў даведаўся камандзір палка. Праз некалькі дзён ён паклікаў Вялічку да сябе і прапанаваў яму стаць снайперам.

Так неўзабаве былы кулямётчык апынуўся ў снайперскай школе. Праўда, як і іншыя, зноў быў на перадавой.

– Першага гітлераўца я так высачыў, – успамінае Генадзь Іосіфавіч, – Пайшоў з таварышам на агнявыя пазіцыі нашых мінамётчыкаў. Стаў назіраць у бінокль за варожай траншэяй, убачыў там некалькі аўтаматчыкаў...

Праўда, да варожай траншэі было далекавата – больш за трыста метраў. Але снайпер здолеў злавіць фашыста ў аптычны прыцэл. Грымнуў стрэл, і ўсе ўбачылі, як з галавы фашыста зляцела каска і той больш не ўстаў.

Вызначыўся снайпер Генадзь Вялічка і ў час контрнаступлення нашых войск пад Сталінградам. Ён прымаў удзел у групавым снайперскім паляванні. Праўда, першая вылазка не прынесла яму поспеху. За ўвесь дзень не падстрэліў ніводнага гітлераўца. Затое на другі яму пашанцавала. Яшчэ прыцемкамі ён заняў зручную пазіцыю ў падвальным памяшканні школьнага будынка і неўзабаве заўважыў, як раўчуком да пярэдняга краю набліжаецца кухня. Да яе і накіраваліся варожыя салдаты з кацялкамі. Кухня спынілася ля прыгорка. Стварылася чарга, і повар пачаў раздаваць ежу. Снайпер стрэліў у салдата, які стаяў у чарзе апошнім. Але гэтага ніхто не заўважыў. Грымнуў другі стрэл, трэці. І кожная куля трапляла ў цэль. Дайшла чарга і да повара, якога снайпер зняў у той момант, калі ён спрабаваў на кагосьці з салдат крычаць...

Вялікага поспеху дабіўся снайпер улетку 1943 года, калі знаходзіўся ў абароне на Паўднёвым Данцы. Ён давёў рахунак асабістай помсты гітлераўцам да трохсот трыццаці знішчаных акупантаў. За праяўленую мужнасць і гераізм Прэзідыум Вярхоўнага

Савета СССР прысвоіў Генадзю Іосіфавічу Вялічку званне Героя Савецкага Саюза.

Славуты снайпер змагаўся за вызваленне Украіны, удзельнічаў у баях на тэрыторыі Польшчы, Перамогу сустрэў у Чэхаславакіі.

**Цітоў, І. Снайперскі рахунак / Іван Цітоў // Ударны фронт (Шклоў). — 1980. — 21 кастрычніка. — С. 3.**